ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА КУЛЬТУРЫ
«ГОРАЦКАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕТКА»
ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ М. ГАРЭЦКАГА

# КАЛЯНДАР знамянальных і памятных дат па ГОРАЦКАМУ раёну на 2024 год




ГОРКІ, 2023


2024
1
Горки
1544
2024

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА КУЛЬТУРЫ
«ГОРАЦКАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕТКА»
ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ М. ГАРЭЦКАГА

# КАЛЯНДАР знамянальных і памятных дат па ГОРАЦКАМУ раёну на 2024 год



ГОРКІ, 2023

У каляндары знамянальных і памятных дат Горацкага раёна на 2024 год прадстаўлены даты, якія адлюстроўваюць важнейшыя падзеі гісторыі, палітычнага, гаспадарчага і культурнага жыцця раёна, дзейнасць знакамітых людзей, звязаных з нашым краем.

Матэрыял размяшчаецца ў храналагічнай паслядоўнасці, кожная дата забяспечана кароткай інфармацыйнай даведкай. У выпадку неўстанаўлення дакладнай даты, інфармацыя пра яе змешчана ў раздзеле "У 2024 годзе таксама спаўняецца".

Пры правядзенні пошукавай работы некаторыя даты каляндара былі ўдакладнены і прыводзяцца ў новай рэдакцыі.

Пры падрыхтоўцы каляндара былі выкарыстаны даведачныя выданні і электронныя краязнаўчыя базы даных з фонду цэнтральнай бібліятэкі імя М. Гарэцкага.

**Каляндар знамянальных і памятных дат па Горацкаму раёну на 2024 год** / ДУК "Горацкая раённая бібліятэчная сетка", Цэнтральная бібліятэка імя М. Гарэцкага ; складальнік Н. Дылькова ; адказны за выпуск А. Марозава. – Горкі, 2023. – 36 с.

# Памятныя даты



*Горкі*





*БДСГА*



*Горацкі райвыканкам*



*Чыгуначная станцыя “Пагодзіна”*

**480 год**

– з дня **першага ўпамінання Горак** у пісьмовых крыніцах (1544).

**225 год**

– з дня наведвання Горак рускім пісьменнікам **Г. Дзяржавіным** і напісання ім верша “Горкі” (12 чэрвеня 1799).

**135 год**

– з дня, калі ўпершыню ў газеце “Минский листок” надрукавана беларуская паэма **“Тарас на Парнасе”** дзеянні якой адбываюцца ў Горках (16 мая 1889).

**110 год**

– з пачатку будаўніцтва **чыгуначнай лініі “Орша-Унеча”**, якая праходзіць праз Горкі (1914).

**105 год**

– з дня рэарганізацыі Горацкіх сярэдніх сельскагаспадарчых устаноў у **Горацкі сельскагаспадарчы інстытут** (7 красавіка 1919 г.);

– з дня стварэння **друкарні пры Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце** (1 кастрычніка 1919).

**100 год**

– з дня ўтварэння **Горацкага раёна** (17 ліпеня 1924);

– з дня, калі быў узведзены **будынак чыгуначнай станцыі** “Беларускія Горкі” (з 1930 г. станцыя “Пагодзіна”) (1924);

– з дня заснавання **Горацкага раённага Саюза спажывецкіх таварыстваў** (1924);

# Памятныя даты



*Маслакоўская сельская бібліятэка*

– з дня ўтварэння на першым устаноўчым сходзе краязнаўцаў раёна і Горацкага сельскагаспадарчага інстытута **раённага краязнаўчага таварыства** (7 снежня 1924);

– з дня адкрыцця **Маслакоўскай сельскай бібліятэкі** (1924).



*Рэкцянская сельская бібліятэка*

**95 год**

– з дня, калі ў раёне пачалася **калектывізацыя.** Першымі ў калектыўную гаспадарку аб'ядналіся жыхары вёскі Сялец. Калгас назвалі "Чырвоны батрак" (1929);

– з дня адкрыцця **Рэкцянскай сельскай бібліятэкі** (1929);

– з дня заснавання **Горацкага хлебазавода** (1929).



*Ленінская сярэдняя школа*

**85 год**

– з дня адкрыцця **Ленінскай сярэдняй школы** (1939 ) і **65 год** з дня адкрыцця **новага будынку** школы (1959);

– з дня адкрыцця **раённай дзіцячай бібліятэкі** (1939).



*Раённая дзіцячая бібліятэка*

# Памятныя даты



*Помнік вызваліцелям Горацкага раёна*

## 80 год

– **з дня вызвалення Горак і Горацкага раёна** воінамі 70-й стралковай дывізіі пад камандаваннем **М.М. Калеснікава** (26 чэрвеня 1944).



*Бюст І.І. Якубоўскага*

## 75 год

– з дня адкрыцця помніка **У.І. Леніну** ў гарадскім скверы (7 лістапада 1949);

– з дня адкрыцця бюста двойчы Героя Савецкага Саюза **І.І. Якубоўскага** (13 лістапада 1949);

– з дня стварэння **Горацкай раённай арганізацыі ДТСААФ** (1949).



*Дзіцячая школа мастацтваў і вакальна-харавога майстэрства*

## 70 год

– з дня адкрыцця ў Горках музычнай школы, цяпер гэта **ДУА "Дзіцячая школа мастацтваў і вакальна-харавога майстэрства г. Горкі"** (1 верасня 1954 г.);

– з дня выхаду першага нумару шматтыражнай газеты БДСГА **"Советский студент"** (5 снежня 1954).



*Аўсянкаўская сельская бібліятэка*

## 65 год

– з дня адкрыцця **Аўсянкаўскай сельскай бібліятэкі** (1959);

– з дня адкрыцця паветранай **авіяцыйнай лініі** зносін паміж Горкамі і Мінскам (5 жніўня 1959);

– з дня адкрыцця **новай бальніцы** на 25 ложкаў у пасёлку Леніна (1959);

– з дня адкрыцця **ДЮСШ** (1 верасня 1959).



*Ленінская сярэдняя школа*

# Памятныя даты



*УКСП «Горацкае»*

## 60 год

– з дня, калі была зманціравана **першая індывідуальная газабалонная ўстаноўка** ў Горках па адрасу: вуліца Леніна,16 (12 мая 1964);

– з дня ўтварэння **саўгаса "Горацкі"** (цяпер УКСП "Горацкае") з цэнтрам у вёсцы Рэкта. Першы дырэктар – **М.Е. Нікалаеў** (1964);

– з дня ўстанаўлення на тэрыторыі БДСГА **помнікаў А.І. Сцебуту, А.В. Саветаву, М.В. Рытаву, Д.М. Пранішнікаву, М.Ф. Іванову** (1964);

– з дня пабудовы **36-кватэрнага жылога дома** па вуліцы Інтэрнацыянальнай (цяпер вул. Якубоўскага) з **гастраномам "Цэнтральны"** і **аптэкай** (кастрычнік 1964).



*Горацкі аўтавакзал. 2012*

## 55 год

– з дня пабудовы **Дома культуры ў саўгасе "Леніна"** на 400 месцаў (кастрычнік 1969).



*Горацкае педагагічнае вучылішча*

## 50 год

– з дня адкрыцця новага будынку **аўтавакзала** (6 сакавіка 1974);

– з дня прыняцця рашэння СМ БССР аб адкрыцці ў **Леніна педагагічнага вучылішча** (10 чэрвеня 1974);



*Ленінскі Дом культуры*

# Памятныя даты



*Помнік загінуўшым землякам у в. Палёнка*



*Прадуктовы магазін на акадэміі*



*ВІА “Рэзананс”. 2017 г.*

– з дня адкрыцця **ў Палёнцы мемарыялу**, які ўвекавечвае памяць землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (30 чэрвеня 1974);

– з дня адкрыцця новага **прадуктовага магазіна** паміж восьмым і дзявятым інтэрнатамі БДСГА (28 верасня 1974);

– з дня пабудовы **Маслакоўскага Дома культуры** (кастрычнік 1974).

## 45 год

– з дня стварэння народнага вакальна-інструментальнага **ансамбля “Рэзананс”** (пры БДСГА) (1979);

– з дня адкрыцця ў Горацкай СШ № 3 **музея баявой славы** (24 чэрвеня 1979);

– з дня падпісання Дзяржаўнай камісіяй акта аб здачы ў эксплуатацыю **базы газавай гаспадаркі**. Калектыў “Горкіміжрайгаз” перасяліўся на новае месца (кастрычнік 1979).

– з дня ўвядзення ў эксплуатацыю новага будынку Горскай СШ (люты 1979).



*Маслакоўскі Дом культуры*

# Памятныя даты



*Дзіцячы сад "Сонейка"*

**40 год**

– адкрыўся **дзіцячы сад "Сонейка" АГП "Горацкае"** (7 лютага 1984);

– з дня заснавання звання **"Ганаровы грамадзянін г. Горкі"**. Першымі ганаровымі грамадзянамі сталі **А.І. Мішына** і Героі Савецкага Саюза **М.І. Грыбкоў, І.Л. Грыгор'еў** (26 чэрвеня 1984);



*Першыя ганаровыя грамадзяне г. Горкі: М.І. Грыбкоў, І.Л. Грыгор'еў, А.І. Мішына*

– з дня адкрыцця на цэнтральнай сядзібе калгаса імя Свярдлова ў вёсцы Горы **помніка Міхаілу Сяргеевічу Мандрыкаву** (5 лістапада 1984);

– з дня прыняцця сумеснай пастановы № 34-1016/27 бюро Горацкага гаркама КПБ, выканкамаў раённага Савета народных дэпутатаў і гарадскога Савета народных дэпутатаў аб стварэнні ў Горках дзяржаўнага **гісторыка-этнаграфічнага музея** (14 снежня 1984);

– з дня стварэння **Горацкага народнага эстраднага гурта** пры раённым Доме культуры (з 2003 раённы Цэнтр культуры) (1984).



*Горацкі народны эстрадны гурт. 2012 г.*

# Памятныя даты



Горацкая гімназія № 1



Паршынская сярэдняя школа



Ансамбль народнай песні "Дабраначка"



Аўсянкаўскі Дом культуры

## 35 год

– адбылася ўстаноўчая канферэнцыя раённай арганізацыі Беларускага таварыства інвалідаў, якая прыняла рашэнне аб стварэнні **раённай арганізацыі Беларускага таварыства інвалідаў** (10 студзеня 1989);

– з дня адкрыцця ў Горках школы № 5, рэарганізаванай затым у **гімназію № 1** (11 студзеня 1989);

– з дня адкрыцця **Паршынскай сярэдняй школы** (1989);

– з дня стварэння ансамбля народнай песні **"Дабраначка"**. Кіраўнік – ***В.Г. Осіпава*** (1989);

– з дня стварэння **Дзяржаўнай сортавыпрабавальнай станцыі** на базе эксперыментальнай базы "Пагодзіна" (1989);

– з дня стварэння арганізацый **ПМК-1 і ПМК-2** (1989);

– з дня адкрыцця **Аўсянкаўскага Дом культуры** (1989 г.);

– з дня адкрыцця **Горацкага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея** (15 лютага 1989);



Горацкі гісторыка-этнаграфічны музей. 2018 г.

# Памятныя даты



Ускладанне кветак да помніка землякам, загінуўшым у гады вайны



Народнае аматарскае аб'яднанне "Лазінка". 2008 г.



Белінветсбанк



Калекцыя народнай дзіцячай студыі "Чарадзейка".

– з дня стварэння **РА "Саюз ветэранаў Афганістана"** (1989).

## 30 год

– з дня ўрачыстага адкрыцця **помніка землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны,** які ўстаноўлены каля гарадскога стадыёна (26 чэрвеня1994);

– з дня адкрыцця на будынку корпуса № 10 БДСГА мемарыяльнай дошкі, прысвечанай былому рэктару акадэміі ***І.Ф. Гаркушу*** (1 верасня 1994);

– з дня аднаўлення сваёй дзейнасці **раённага краязнаўчага таварыства** (1994);

– з дня стварэння **народнага аматарскага аб'яднання "Лазінка"** (1994);

– з дня адкрыцця Горацкага аддзялення АКБ **"Белінвестбанк"** (1994).

## 25 год

– з дня, калі ўпершыню быў здзейснены **пуск прыроднага газу** ў Горках у жылыя дамы мікрараёна вуліцы Калініна (5 верасня 1999);

– з дня адкрыцця ў раённым **Доме рамёстваў выставачнай залы** (9 кастрычніка 1999);

– з дня стварэння дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі **"Горацкі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі"** (кастрычнік 1999);

– з дня стварэння народнай дзіцячай студыі мастацкай творчасці **"Чарадзейка"** пры Горацкай дзіцячай школе мастацтваў і мастацкіх рамёстваў (1999);

# Памятныя даты

– з дня стварэння ансамбля **“Тараторкі”** пры Копцеўскім Цэнтры культуры (1999);

– з дня, калі на Горацкім вузле электрычнай сувязі быў **адкрыты камп’ютарны доступ ў Інтэрнэт** (1999).

## 20 год

– з дня адкрыцця **“Лячэбна-працоўнага прафілакторыя № 2”** (1 чэрвеня 2004);

– з дня адкрыцця **Горскай сельскай бальніцы сястрынскага ўходу** (1 кастрычніка 2004);

– з дня стварэння ўзорнай дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва **“Мастыхін”** пры Горацкай дзіцячай школе мастацтваў і мастацкіх рамёстваў (2004);

– з дня адкрыцця новага **магазіна** Горацкага райспажыўсаюза **“Ясень”**, што па праспекту Інтэрнацыянальнаму (верасень 2004).

## 15 год

– з дня адкрыцця на вучэбным корпусе № 3 БДСГА **мемарыяльнай дошкі *А.М. Брагіну***, доктару сельскагаспадарчых навук, прафесару, заслужанаму работніку вышэйшай школы БССР, які працаваў у акадэміі ў 1949-1989 гг. (верасень 2009 г.);

– з дня адкрыцця **Горскага сельскага Цэнтра фальклора і народнай творчасці** (верасень 2009 г.);

– з дня атрымання вёскамі **Красуліна, Сава** (лістапад 2009) **статуса аграгарадка**.



*Народны вакальны ансамбль “Тараторкі”. 2012 г.*



*Дзіцячая студыя выяўленчага мастацтва“Мастыхін”*



*Магазін “Ясень”*



*Горскі Цэнтр фальклора і народнай творчасці*



# Памятныя даты

## 10 год

– з дня ўтварэння **Горацкага раённага аб’яднання арганізацый прафсаюзаў** (23 снежня 2014).

– з дня ўтварэння **Аддзела прымусовага выканання Горацкага раёна** (1 студзеня 2014);

– з дня адкрыцця ў вучэбным корпусе № 8 БДСГА **мемарыяльнай дошкі А.А. Кононаву** (2014).



*Парк сямейных дрэў*

## 5 год

– з дня закладкі ў Горках на адкрытай пляцоўцы каля слабадскога мосту **Парка сямейных дрэў** (13 красавіка 2019);

– назад Горкі прымалі эстафету агню **“Полымя міру” II Еўрапейскіх гульняў**, якія адбыліся ў Мінску (1 чэрвеня 2019);



*Эстафету агню “Полымя міру” II Еўрапейскіх гульняў*

– з дня адкрыцця ў аграгарадку Сава **мемарыяльнай дошкі** ў гонар ураджэнца гэтай вёскі, гвардыі капітана, камандзіра спецыяльнай дыверсійна-разведвальнай групы “Неўскі” разведаддзела штаба 2-га Беларускага фронту **І.Е. Чэрнікава** (2 ліпеня 2019);



*Мемарыяльная дошка ў памяць Васіля Каваля*

– з дня адкрыцця ў аграгарадку Сава **мемарыяльнай дошкі** ў памяць ураджэнца гэтай вёскі, беларускага пісьменніка **Васіля Каваля** (30 кастрычніка 2019).

– з дня адкрыцця у Горках **бізнес-інкубатара ААТ “Тэхнапарк “Горкі”** (14 лістапада 2019).

# Кнігі-юбіляры. Творы-юбіляры




**100 год**

**Гарэцкі М.** Практычны расійска-беларускі слоўнік (Мінск, 1924).

**95 год**

**Каваль В.** Крыніца (Мінск, 1929).

**75 год**

**Щербатов Г.** Комсомол Белоруссии в боях за Родину (Минск, 1949).




**60 год**

**Булахаў М.** Прыметнік у беларускай мове (Мінск, 1964).

**Разгон, Л.** Шестая станция (Москва, 1964).

**55 год**

**Разгон Л.** Мир, в котором дети – не гости (Москва, 1969).

**45 год**

**Булахов М.** Основные вопросы сопоставительной стилистики русского и белорусского языков (Минск, 1979).

**Жилин М.** Огненное ожерелье (Масква, 1979).

**Разгон Л.** Сила тяжести (Москва, 1979).





















# Кнігі-юбіляры. Творы-юбіляры

**40год**

**Лившиц В.** Горки (Минск, 1984).

**35 год**

**Булахов М.** "Слово о полку Игореве" в литературе, искусстве, науке (Минск, 1989).

**Разгон Л.** Непридуманное (Москва, 1989).

**30 год**

**Грабчыкаў С.** Слоўнік паронімаў беларускай мовы (Мінск, 1994).

**Ліўшыц У.** Горацкай зямлі адважныя сыны (Горкі, 1994).

**Прохараў А.** Чарадзейка (Мінск,1994).

**Разгон Л.** Плен в своем Отечестве (Москва, 1994).

**25 год**

**Васильев Л.** Избранное (Горкі, 1999).

**Ковалева Н.** Ликующий полет (Минск, 1999).

**Лившиц В.** Верность земле. Горки (Горки, 1999).

**Лившиц В.** Герои Советского Союза – уроженцы Горецкого района (Орша, 1999).

**Лившиц В.** Горки: история и современность (Горкі, 1999).

**Лившиц В.** Горы-Горецкий земледельческий институт (1836-1864 гг.) (Горки, 1999).









# Кнігі-юбіляры. Творы-юбіляры













**Ліўшыц У**. Даследчык беларускай літаратуры (Орша, 1999).
**Лоцманаў С.** Истоки (Горки, 1999).
**Бацькаўшчына** : зборнік матэрыялаў краязнаўчай канферэнцыі, (Горкі, май 1998 г.) (Горкі, 1999).

## 20 год

**Кавалёва Н.** Хто галоўны на сяле (Магілёў, 2004).
**Кісялёў С.** Родник (Горки, 2004).
**Терешко С.** Во славу погибших (Горки, 2004).
**Терешко С.** Огненные всполохи (Горки, 2004).
**Бацькаўшчына** : матэрыялы раённай краязнаўчай канферэнцыі (г. Горкі, 2003) (Горкі, 2004).

## 15 год

**Аронова А.** Оазис счастья (Горки, 2009).
**Булахов М.** Избранные работы по языкознанию: русистика, белорусистика, славистика (Минск, 2009).
**Грушина Л.** Когда душа грустит (Горки, 2009).
**Кавалёва Н.** Са скрыпачкай ды з дудой (Горкі, 2009).













# Кнігі-юбіляры. Творы-юбіляры













**Клачкоў А.** Колер і гук (Горкі, 2009).

**Лившиц В.** Горецкая еврейская община: страницы истории (Нацрат Илит, 2009).

**Бацькаўшчына** : зборнік навукова-публіцыстычных матэрыялаў канферэнцыі (2008, г. Горкі) (Горкі, 2009).

**Над родным краем жураўлі** (Горкі, 2009).

## 10 год

**Гавриленко Т.** Сердце в огне (Минск, 2014).

**Жилин М.** Тропа к гейзерам (2014).

**Ковалева Н.** Двери милосердия (Минск, 2014).

**Лившиц В.** Гордость и слава Горецкой земли : Книга 2. (Горки, 2014).

**Эхо нашей Победы** : к 70-летию освобождения Беларуси и Горецкого района от немецко-фашистских захватчиков (Минск, 2014).















# Кнігі-юбіляры. Творы-юбіляры









**5 год**

**Андрэева Л.** Атожылкі (Мінск, 2019).

**Андрэева,Л.** Сугучнасць душ... (Мінск, 2019).

**Дарогі памяці жывыя...** : [зборнік] (Мінск, 2019).

**Душы не спыніцца палёт...** : да 70-годдзя з дня нараджэння члена Саюза пісьменнікаў Беларусі **Ніны Кавалёвай** (Мінск, 2019).

**Іскроў Л.У.** Курсанты, офицеры (2019).

**Ластачкіна С.** Вера создает реальность (Минск, 2019).

**Ліўшыц У.** Раскопкі вакол Горацкага "Парнаса" (Кн. 1-3. Горкі, 2019).

**Самусенко Л. А.** Отблески военных лет (Минск, 2019).

**Сілін У.** Сахаровка. Деревня моя от времен изначальных (Кн. 1. 2019).

**Терешко С.** Река жизни (Минск, 2019).

**Череда К.** Шаги к человеку (Горки, 2019).








# Юбілейныя даты

**У 2024 г. спаўняецца:**



*Чатыркін У.С.*



*Каробкін М.Я.*



*Шапавалаў П.Г.*

**140 год** з дня нараджэння **ХМУРОВІЧА ІВАНА ПРОХАРАВІЧА** (1884, г. Горкі Магілёўскай вобл. – 1968), канструктара зброі.

**125 год** з дня нараджэння **ЧАТЫРКІНА УЛАДЗІМІРА СЯРГЕЕВІЧА** (1899, в. Горы Горацкага пав. Магілёўскай губ. – 1966, г. Кішынёў), вучонага ў галіне жывёлагадоўлі, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі Малдаўскай ССР, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара.

**125 год** з дня нараджэння **КАРОБКІНА МІКАЛАЯ ЯЎХІМАВІЧА** (1899, в. Карма-Доўгая Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл. – 30.03.1946, г. Горкі), участковага ўпаўнаважанага Горацкага райаддзела міліцыі. Загінуў пры ліквідацыі банды, якая дзейнічала на тэрыторыі Горацкага і Мсціслаўскага раёнаў.

**120 год** з дня нараджэння **ШАПАВАЛАВА ПЯТРА ГАПЕЕВІЧА** (1904, г. Горкі Магілёўскай вобл. – 30.09.1941), аднаго з арганізатараў камуністычнага падполля і партызанскага руху ў Пінскай вобласці ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

**105 год** з дня нараджэння **ДЗЯМ'ЯНАВА КІРЫЛА МІКІТАВІЧА** (1919 – ?, в. Палёнка Горацкага р-на), заслужанага работніка сельскай гаспадаркі.

# Памятныя даты
## Студзень



*Маскалёва Н.В.*



*Жаркоўскі Д.У.*



*Клімаў М.Т.*



*Панамарова К.Я.*

## Студзень

**1 – 95 год** з дня нараджэння **МАСКАЛЁВАЙ НІНЭЛЬ ВАСІЛЬЕЎНЫ** (1.01.1929, в. Мокрадзь Дрыбінскага раёна – май 2010, г. Горкі), заслужанай настаўніцы БССР (1967).

**2 – 120 год** з дня нараджэння **ЖАРКОЎСКАГА ДАНІЛЫ УЛАДЗІМІРАВІЧА** (2.01.1904, в. Ходараўка Горацкага пав. Магілёўскай губ. – 31.12.1987, г. Мінск), хіміка, доктара хімічных навук, прафесара.

**3 – 95 год** з дня нараджэння **КЛІМАВА МІХАІЛА ТРАФІМАВІЧА** (3.01.1929, в. Міхайлавічы Горацкага раёна), Героя Сацыялістычнай Працы, заслужанага настаўніка рабочай моладзі БССР.

**8 – 95 год** з дня нараджэння **ПАНАМАРОВАЙ КАЦЯРЫНЫ ЯКАЎЛЕЎНЫ** (8.01.1929, в. Галёнкі Горацкага р-на Магілёўскай вобл. – 21.03.1998, г. Горкі), заслужанай настаўніцы БССР.

**30 – 75 год** з дня нараджэння **КЛЮЧАРОВАЙ ГАННЫ АЛЯКСАНДРАЎНЫ** (30.01.1949, г. Горкі), беларускага вучонага ў галіне клінічнай медыцыны, доктара медыцынскіх навук, прафесара.



*Ключарова Г.А.*

## Люты



*Мядзвядзёў І.Е.*

**2 – 105 год** з дня нараджэння **МЯДЗВЯДЗЁВА ІГНАТА ЕЛІСЕЕВІЧА** (2.02.1919, в. Маслакі Горацкага раёна Магілёўскай вобл. – снежань 2007, в. Маслакі Горацкага раёна), заслужанага работніка сельскай гаспадаркі.



*Пятровіч Э.А.*

**8 – 215 год** з дня нараджэння **ТРАЎТФЭТАРА РУДОЛЬФА ЭРНЭСТАВІЧА** (8.02.1809 – 12.01.1889, г. Санкт-Пецярбург), доктара філасофіі, доктара прыродазнаўчых навук.

**11 – 85 год** з дня нараджэння **ПЯТРОВІЧА ЭДУАРДА АЛЯКСАНДРАВІЧА** (11.02.1939, г. Жодзіна Смалявіцкага р-на Мінскай вобл.), кандыдата сельскагаспадарчых навук, заслужанага работніка сельскай гаспадаркі.



*Карташэвіч А.М.*

**17 – 75 год** з дня нараджэння **КАРТАШЭВІЧА АНАТОЛЯ МІКАЛАЕВІЧА** (17.02.1949, г. Слуцк Мінскай вобл.), вучонага ў галіне аўтатрактарабудавання, доктара тэхнічных навук, прафесара, акадэміка Акадэміі аграрнай адукацыі, першага прарэктара БДСГА.



*Свіцін В.А.*

**20 – 75 год** з дня нараджэння **СВІЦІНА ВАСІЛЯ АНДРЭЕВІЧА** (20.02.1949, в. Якубава Дубровенскага р-на Віцебскай вобл.), беларускага вучонага, доктара эканамічных навук, загадчыка кафедры кадастра і зямельнага права землеўпарадкавальнага факультэта БДСГА.



Баранава Н.Ф.



Жалязка У.І.



Коршунаў А.Ф.

**26 – 75 год** з дня нараджэння **ДОБЫШАВА АНАТОЛЯ СЯМЁНАВІЧА** (26.02.1949, в. Шышава Горацкага р-на – люты 2017 г., г. Горкі), беларускага вучонага ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі, доктара тэхнічных навук, прафесара.

**29 – 85 год** з дня нараджэння **БАРАНАВАЙ НІНЫ ФЁДАРАЎНЫ** (29.02.1939, г. Клінцы Бранскай вобл. – снежань 2019), майстрыхі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

## Сакавік

**1 – 75 год** з дня нараджэння **ЖАЛЯЗКІ УЛАДЗІМІРА ІОСІФАВІЧА** (1.03.1949, п. Чырвоная Слабада Салігорскага р-на), вучонага ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі, доктара сельскагаспадарчых навук.

**1 – 70 год** з дня нараджэння **ЖУДРО МІХАІЛА КІРЫЛАВІЧА** (1.03.1954, в. Ванюжычы Петрыкаўскага р-на), вучонага ў галіне эканомікі, доктара эканамічных навук, прафесара БДСГА.

**4 – 100 год** з дня нараджэння **КОРШУНАВА АЛЯКСАНДРА ФАМІЧА** (4.03.1924, в. Палішына Горацкага р-на – 12.07.1991, г. Мінск), літаратуразнаўцы, гісторыка, даследчыка старажытнай беларускай літаратуры, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі імя Я. Коласа.

# Памятныя даты

## Сакавік



Татарская Г.І.



Арлоўскіх С.В.



Міхалёў Я.К.



Іваноў С.Н.

**5 – 135 год з** дня нараджэння **ГАРБАЧОВА ЯФІМА ВАСІЛЬЕВІЧА** (5.03.1889, г. Горкі Магілёўскай губерні – ?), рэвалюцыянера, члена РСДРП.

**5 – 150 год з** дня нараджэння **ТАТАРСКАЙ ГАННЫ ІЗРАЙЛЕЎНЫ** (5.03.1884, мяст. Шчэдрын Жлобінскага пав. Гомельскай губ. – 1941, г. Барысаў), заслужанага ўрача БССР. Галоўны ўрач Горацкай раённай бальніцы ў 1924-1941 гг.

**8 – 60 год з** дня нараджэння **АРЛОЎСКІХ СЯРГЕЯ ВІКТАРАВІЧА** (8.03.1964, г. Горкі – 20.04.1984, Афганістан), удзельніка вайны ў Афганістане.

**17 – 165 год** з дня нараджэння **БЯЛЕЎСКАГА АЛЯКСЕЯ СЦЯПАНАВІЧА** (17.03.1859, в. Шэды Горацкага пав. – 1919, г. Іркуцк), народавольца, рэвалюцыянера і журналіста.

**20 – 115 год** з дня нараджэння **МІХАЛЁВА ЯКАВА КІРЫЛАВІЧА** (20.03.1909, в. Машкова Горацкага р-на Магілёўскай вобл. – 27.05.1985), вучонага ў галіне земляробства, доктара сельскагаспадарчых навук.

**20 – 115 год** з дня нараджэння **ІВАНОВА СЯРГЕЯ НЕСЦЕРАВІЧА** (20.3.1909, в. Валынцава Горацкага пав. Магілёўскай губ. – 22.7.1994), вучонага ў галіне глебазнаўства, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара, заслужанага дзеяча навук Беларусі.

# Памятныя даты

## Красавік

**26 – 75 год** з дня нараджэння **МАРУШКА КАЦЯРЫНЫ ПЯТРОЎНЫ** (26.03.1949, в. Рэдзігірава Лунінецкага р-на Магілёўскай вобл.), кандытара Горацкага хлебазавода, заслужанага работніка прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

**28 – 75 год** з дня нараджэння **ФЯДОСАВАЙ НІНЫ ХАРЫТОНАЎНЫ** (28.03.1949, в. Масалыкі Горацкага р-на Магілёўскай вобл.), доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара, члена праўлення Міжнароднага камітэта ESDAR (Еўрапейскае аддзяленне) па пытаннях рэпрадукцыі жывёл.



*Фядосава Н.Ф.*



*Казлоўская І.П.*

## Красавік

**5 – 65 год** з дня нараджэння **КАЗЛОЎСКАЙ ІРЫНЫ ПЯТРОЎНЫ** (5.04.1959, г. Горкі), вучонага ў галіне сельскай гаспадаркі, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара.

**6 – 70 год** з дня нараджэння **АНЮХОЎСКАГА АНАТОЛЯ ВАСІЛЬЕВІЧА** (06.04.1954, в. Леніна Горацкага р-на), дэпутата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 6-га склікання, "Чалавека года Віцебшчыны" ў намінацыі "Аграпрамысловы комплекс".

**8 – 95 год** з дня нараджэння **КІРЫЛЬЧЫК ЛЮДМІЛЫ АЛЯКСАНДРАЎНЫ** (8.04.1929, г. Чэрвень, Мінская вобласць – 10.04.2010, г. Горкі), кандыдата біялагічных навук, дырэктара батанічнага сада БДСГА.



*Кірыльчык Л.А.*



*Кірыенкаў І.М.*

**19 – 110 год** з дня нараджэння **КІРЫЕНКАВА ІВАНА МІХАЙЛАВІЧА** (19.04.1914, в. Елаўцы Хіславіцкага р-на Смаленскай вобл., Расія – 16.06.2008, г. Горкі), майстра дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.



*Сонцаў К.М.*

**13 – 110 год** з дня нараджэння **СОНЦАВА КАНСТАНЦІНА МІХАЙЛАВІЧА** (13.04.1914, с. Соф'іна Раменскага р-на Маскоўскай вобл., Расія – 7.11.1995, г. Масква), вучонага ў галіне жывёлагадоўлі, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, рэктара БСГА ў 1964-1977 гг.



*Шаршуноў В.А.*

**22 – 115 год** з дня нараджэння **БРАГІНА АНАТОЛЯ МІХАЙЛАВІЧА** (22.04.1909, с. Новая Чыгла Талаўскага р-на Варонежскай вобл., Расія – ?, г. Горкі), аграхіміка, доктара сельскагаспадарчых навук, заслужанага работніка вышэйшай школы Беларусі.

## Май

**4 – 75 год** з дня нараджэння **ШАРШУНОВА ВЯЧАСЛАВА АЛЯКСЕЕВІЧА** (4.05.1949, в. Круглоўка Руднянскага р-на Смаленскай вобл., Расія), беларускага вучонага ў галіне машынабудавання, прафесара, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, рэктара БДСГА ў 1992-1995 гг.



*Шчарбатаў Г.М.*

**7 – 105 год** з дня нараджэння **ШЧАРБАТАВА ГЕОРГІЯ МІХАЙЛАВІЧА** (7.05.1919, в. Рэкатка Горацкага р-на Магілёўскай вобл. – 2.02.1957, г. Мінск), беларускага пісьменніка.



Анікееў М.М.

**23 – 75 год** з дня нараджэння **АНІКЕЕВА МІХАІЛА МІХАЙЛАВІЧА** (23.05.1949, в. Нікольск Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл.), дэпутата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, заслужанага работніка сельскай гаспадаркі.



Цярэшка С.А.

**25 – 55 год** з дня нараджэння **БУЦЯ УЛАДЗІМІРА ІВАНАВІЧА** (25.05.1969, г. Днепрадзяржынск, Украіна), беларускага вучонага, доктара эканамічных навук, загадчыка кафедры матэматычнага мадэлявання эканамічных сістэм АПК ў БСГА.

## Чэрвень

**6 – 80 год** з дня нараджэння **ЦЯРЭШКА СВЯТЛАНЫ АЛЯКСАНДРАЎНЫ** (6.06.1944, в. Цёмны Лес Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл.), самадзейнай паэтэсы.



Крышнёў М.В.

**11 – 60 год** з дня нараджэння **КРЫШНЁВА МІХАІЛА ВАСІЛЬЕВІЧА** (11.06.1964, в. Каменка Горацкага р-на Магілёўскай вобл. – 30.01.1984, Афганістан), удзельніка баявых дзеянняў ў Афганістане.



Мажайскі Ю.А.

**12 – 65 год** з дня нараджэння **МАЖАЙСКАГА ЮРЫЯ АНАТОЛЬЕВІЧА** (12.06.1959, в. Стараселле Горацкага р-на), рускага вучонага ў галіне меліярацыі сельскай гаспадаркі, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара, ганаровага прафесара Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі.

# Памятныя даты

## Ліпень


Макеева В.С.

**13 – 85 год** з дня нараджэння **МАКЕЕВАЙ ВАЛЯНЦІНЫ САВЕЛЬЕЎНЫ** (13.06.1939, в. Судоўшчына Мсціслаўскага р-на – 22.08.2013, г. Горкі), кампазітара, педагога.

**19 – 85 год** з дня нараджэння **КУЧЫНАЙ ВОЛЬГІ ФЁДАРАЎНЫ** (19.06.1939, пас. Лесапільнае Вяземскага р-на Хабараўскага краю, Расія), майстрыхі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, самадзейнай спявачкі.


Прохараў А.В.

## Ліпень

**1 – 75 год** з дня нараджэння **ПРОХАРАВА АНАТОЛЯ ВАСІЛЬЕВІЧА** (1.07.1949, в. Рудкаўшчына Горацкага р-на Магілёўскай вобл.), паэта, члена Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь.


Булахаў М.Г.

**22 – 105 год** з дня нараджэння **БУЛАХАВА МІХАІЛА ГАПЕЕВІЧА** (22.07.1919, в. Маслакі Горацкага раёна – 4.05.2012, г. Мінск), лінгвіста, доктара філалагічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі БССР.


Касачоў І.Д.

**25 – 85 год** з дня нараджэння **КАСАЧОВА ІВАНА ДАНІЛАВІЧА** (25.07.1939, в. Акушкі Горацкага раёна Магілёўскай вобл.), доктара медыцынскіх навук, прафесара, заслужанага ўрача Расійскай Федэрацыі, акадэміка Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі.

## Памятныя даты

### Жнівень. Верасень. Кастрычнік

**28 –** **75 год** з дня нараджэння **КАВАЛЁВАЙ НІНЫ ДЗМІТРЫЕЎНЫ** (28.07.1949, в. Еськаўка Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл.– 16.03.2020), паэтэсы, члена Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь.


*Кавалёва Н.Д.*

## Жнівень

**3 –** **125 год** з дня нараджэння **ВІЛЬНЕРА АЗАЛІЯ МАІСЕЕВІЧА** (3.08.1899, г. Горкі Магілёўскай губерні – 1984, г. Ленінград), доктара ветэрынарных навук, прафесара.

**6 –** **95 год** з дня нараджэння **БЕЛЬСКАГА РЫГОРА ВАСІЛЬЕВІЧА** (6.08.1929, в. Цярэсіна Бярэзінскага р-на Мінскай вобл. – 25.10.1998, г. Горкі), Героя Сацыялістычнай Працы.


*Бельскі Р.В.*

## Верасень

**14 –** **55 год** з дня нараджэння **СНАПКОВА МІКАЛАЯ ГЕНАДЗЬЕВІЧА** (14.09.1969, г. Магілёў), дзяржаўнага дзеяча. Выпускнік Горацкай сярэдняй школы.


*Снапкоў М.Г.*

## Кастрычнік

**19 –** **70 год** з дня нараджэння **КРЫВЯНКОВА АЛЯКСАНДРА АФАНАСЬЕВІЧА** (19.10.1954, г. Хоцімск Магілёўскай вобл.), арганізатара сельскагаспадарчай вытворчасці, грамадскага дзеяча.


*Крывянкоў А.А.*


Ерухімовіч А.Р.


Скарына У.У.


Купчынаў І.І.


Гарадзецкі Д.І.

# Памятныя даты
## Кастрычнік. Лістапад

**21 – 90 год** з дня нараджэння **ЕРУХІМОВІЧА АНАТОЛЯ РЫГОРАВІЧА** (21.10.1934, г. Віцебск), суддзі рэспубліканскай і Усесаюзнай катэгорый, трэнерама-кансультанта гандбольнага клуба "Колас" БДСГА.

**26 – 65 год** з дня нараджэння **СКАРЫНЫ УЛАДЗІМІРА УЛАДЗІМІРАВІЧА** (26.10.1959, в. Малая Плотніца Пінскага раёна Брэсцкай вобласці), доктара сельскагаспадарчых навук , прафесара кафедры садаводства і агародніцтва БДСГА.

**30 – 115 год** з дня нараджэння **КУПЧЫНАВА ІВАНА ІОСІФАВІЧА** (30.10.1909, г. Горкі – 1988, г. Гомель), геадэзіста, доктара тэхнічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі БССР.

## Лістапад

**22 – 75 год** з дня нараджэня **МАЛАШКІ ВІКТАРА ВІКТАРАВІЧА** (22.11.1949, в. Жырмоны Уздзенскага р-на), вучонага ў галіне ветэрынарыі, доктара ветэрынарных навук, прафесара БДСГА.

**22 – 125 год** з дня нараджэння **ГАРАДЗЕЦКАГА ДЗМІТРЫЯ ІВАНАВІЧА** (22.11.1899, в. Рэчкі Сенненскага р-на Віцебскай вобл. – 12.11.1966, г. Горкі), партыйнага і грамадскага дзеяча.



*Вермель І.Г.*



*Звяждоўскі Л.М.*



*Багамолаў А.М.*



*Чайка М.Ц.*

# Памятныя даты

## Снежань

**28 – 100 год** з дня нараджэння **ВЕРМЕЛЯ ІЗРАІЛЯ ГАМШЭВІЧА** (28.11.1924, г. Горкі – 3.01.1997, г. Екацярынбург), прафесара кафедры крыміналістыкі Свярдлоўскага юрыдычнага інстытута, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

## Снежань

**11 – 195 год** з дня нараджэння **ЗВЯЖДОЎСКАГА ЛЮДВІКА МІХАЙЛАВІЧА** (11.12.1829, Вільня – 27.02.1864), аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863-1864 гг. у Польшчы, Беларусі і Літве.

**19 – 105 год** з дня нараджэння **БАГАМОЛАВА АЛЯКСЕЯ МІХАЙЛАВІЧА** (19.12.1919, с. Вялікае Іванаўскае Раменскага р-на Маскоўскай вобл. – 2.10.2013, г. Горкі), заслужанага агранома, ганаровага грамадзяніна Горацкага раёна, ганаровага прафесара БДСГА.

**31 – 95 год** з дня нараджэння **ЧАЙКА МАРЫІ ЦІХАНАЎНЫ** (31.12.1929, г. Горкі Магілёўскай вобл. – 30.09.1997, г. Мінск), вучонага ў галіне фізіялогіі і біяхіміі раслін, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, доктара біялагічных навук, прафесара.

# Калі нарадзіліся вёскі
# ГОРАЦКАГА РАЁНА

**480 год** – з дня **першага ўпамінання Горак** у пісьмовых крыніцах (1544).

**425 год** – з дня першага ўпамінання вёсак **Буды, Глінькава, Задарожжа, Канюхі, Кацялева, Малое Марозава, Нежкава, Нівішчы, Паляшчыцы, Рэкта, Сенькава, Філіпава, Малыя Шарыпы** ў пісьмовых крыніцах (1599).

**415 год** – з дня першага ўпамінання вёсак **Галышына, Тосна, Халмы, Чапляёўка** ў пісьмовых крыніцах (1609).

**335 год** – з дня першага ўпамінання вёскі **Кварцяны** ў пісьмовых крыніцах (1689).

**240 год** – з дня першага ўпамінання вёскі **Міхайлавічы** ў пісьмовых крыніцах (1784).

**115 год** – з дня першага ўпамінання вёскі **Клін** у пісьмовых крыніцах (1909).

# Метадычныя парады
# БІБЛІЯТЭКАРАМ

2024 год адзначаны шматлікімі знамянальнымі і памятнымі датамі з гісторыі Горак і Горацкага раёна. Шэраг прадпрыемстваў і ўстаноў горада адзначаць свае юбілейныя даты. Таксама грамадскасць нашага краю будзе адзначаць юбілейныя даты нашых слаўных ураджэнцаў і землякоў.

З гэтай мэтай прапануем правесці наступныя мерапрыемствы краязнаўчай тэматыкі:

- **прэзентацыю**, прысвечаную **Году міру і стварэнню** "Нашы землякі ў свеце" (І. Вермель, А. Вільнер, Д. Жаркоўскі, С. Іваноў, І. Касачоў, Г. Ключарова, А. Коршунаў, І. Купчынаў, Ю. Мажайскі, Я. Міхалёў, Н. Фядосава, І. Хмуровіч, М. Чайка, У. Чатыркін);
- **вечары-партрэты**, прысвечаныя Героям Сацыялістычнай Працы Р. Бельскаму, А. Клімаву, заслужаным настаўнікам БССР Н. Маскалёвай, К. Панамаровай, заслужаным работнікам сельскай гаспадаркі І. Мядзвядзёву, М. Анікееву і інш.;
- **літаратурныя вечары,** прысвечаныя М. Булахаву, В. Жураўлёву, Н. Кавалёвай, А. Коршунаву, А. Прохараву, С. Цярэшка, Г. Шчарбатаву;
- **урокі мужнасці**, прысвечаныя С. Арлоўскіх, А. Бялеўскіх, Я. Гарбачову, Л. Звяждоўскаму, Н. Кавалёвай, М. Каробкіну, І. Касачову, М. Крышнёву, Г. Татарскай, П. Шапавалаву;
- **вечар "Таленты ад роднай зямлі"** , прысвечаны Н. Баранавай, І. Кірыенкаву, Л. Кірыльчык, В. Кучынай, В. Макеевай;
- **завочныя падарожжы** "Край, дзе я жыву" (па бібліятэках-юбілярах, установах культуры-юбілярах, Горацкаму хлебазаводу, ААТ "Горацкае", аграгарадках Красуліна і Сава);

- **краязнаўчыя гадзіны** "Гартаючы старонкі гісторыі краю", прысвечаныя 100-годдзю ўтварэння Горацкага раёна і 80-годдзю вызвалення Горак і Горацкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў;
- **краязнаўчыя віктарыны** "Ці ведаеце вы свой край?";
- **бібліятэчныя выставы** ("Мой край у лёсе Беларусі"; "БДСГА – кузня кадраў"); **бібліятэчныя выставы** кніг-юбіляраў ураджэнцаў краю і мясцовых аўтараў;
- **інфармацыйныя лісткі** да дня нараджэння юбіляраў;
- **бібліяграфічныя агляды**;
- **прэзентацыі кніг-юбіляраў**;
- **бенефіс адной кнігі і інш**.

# Каляндар знамянальных і памятных дат па Горацкаму раёну на 2024 год

Складальнік: Н. Дылькова

Адказны за выпуск: А. Марозава

*Надрукавана на аргтэхніцы цэнтральнай бібліятэкі імя М. Гарэцкага*

*Горацкая цэнтральная бібліятэка імя М. Гарэцкага.*
*Вул. Якубоўскага, 40, 212410, Горкі.*
*E-mail: rbs@centrgorki.by.*
*www.lib-gorki.mogilev.by*

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА КУЛЬТУРЫ
«ГОРАЦКАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕТКА»
ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ М. ГАРЭЦКАГА

ГОРКІ, 2023